*К.А. Дзічкоўская*

# ПРАЯЎЛЕННІ РЭГІЯНАЛІЗМУ Ў ІТАЛЬЯНСКАЙ КУЛЬТУРЫ

SUMMARY

The present article deals with the phenomena of regionalism in the Italian culture. The regionalism is considered as one of the essential characteristics of the Italian society and is observed in its way of living.

Праблема рэгіяналізму з'яўляецца адной з актуальных у сучасным грамадстве. Рэгіяналізм характарызуецца сацыяльнай згуртаванасцю пражываючых супольна этнічных расавых і моўных груп, сумеснасцю агульных каштоўнасцей, звязаных культурай, рэлігіяй, гіста-рычнымі традыцыямі і палітычнай салідарнасцю. Ён прысутнічае ва ўнутраных грамадскіх адносінах, не заўсёды мае палітычнае аблічча, уласцівы ўсім тыпам сучасных грамадстваў, незалежна ад іх узроўню развіцця, асаблівасці палітычных структур і г. д. Дадзеныя адрозненні існуюць і ў маленькай Албаніі, і ў вялікім Кітаі. *Рэгіяналізм* – гэта натуральны, арганічны прынцып тэрытарыяльнай арганіза-цыі сацыяльных, палітычных, эканамічных і культурных працэсаў. Роберт Дал і Эдвард Тафт пісалі, што «чем больше компактной и однородной является система, тем меньше вариаций политических действий внутри нее, тем больший процент граждан придерживается единого кодекса поведения, нормы которого легко передаются словом и примером, а нарушения становятся видимыми. Следовательно, облегчается применение санкций посредством жестких или мягких форм социального взаимодействия и затрудняется уклонение от санкций... В небольшой системе снижается групповая лояльность и усиливается общая солидарность» [7, с. 72–93].

Можна чуць аб курсе ўрада, часта маючага канатацыю з тэрмінам «рэгіяналізм»,– гэта не больш чым адлюстраванне (адэкватнае ці скажонае) тых існуючых магчымасцей ці патрэбнасцей, якія выцякаюць з самога прынцыпу прасторава-тэрытарыяльнага размеркавання чалавечых супольнасцей. Пры ігнараванні на афіцыйным узроўні рэгіяналізм існуе ў пасіўнай (падаўленай) форме і праяўляецца ў розных прывычках, звычаях, тыпах менталітэту, публічнай актыўнасці, культурных асаблівасцях і г. д. Гэты від вызначаецца агульнай ідэнтычнасцю, культурай, гісторыяй, геаграфіяй, ЁН накіраваны на практычнае выкарыстанне тых магчымасцей, якія выцякаюць з натуральнага тэрытарыяльнага падзелу сучасных грамадстваў.

Важнасць праблемы рэгіяналізму вызначаецца тым, што ў некаторых дзяржавах свету колькасць этнічных адзінак налічваецца ад двух да пяці тысяч. Ва ўмовах шматнацыянальнай дзяржавы, дзе дзесяткі народаў і этнасаў на працягу пэўнага гістарычнага перыяду інтэграваны ў агульную жыццёвую прастору, праблема этнакультурнага ўзаемадзеяння мае першаснае значэнне. Цэнтральнае месца займае пытанне захавання духоўна-маральнай спадчыны, гісторыка-культурнага набытку кожнай этнічнай супольнасці [2, с. 14–21].

Адной з рыс сучаснага італьянскага грамадства з'яўляецца рэгіянальна-культурная ідэнтычнасць народа. Гэта асноўная складаючая італьянскага менталітэту. Дзяржава Італія створана не на прынцыпе этнічнай чыстаты, а на адзінстве тэрытарыяльнага, сацыяльнага, эканамічнага і культурнага. «Італія – гэта толькі геаграфічная назва»,– дастаткова цынічна сказаў аўстрыйскі канцлер Метэрніх, калі яна сапраўды была раздроблена на мноства маленькіх дзяржаў. Пасля уніфікацыі 1861 г. другі вядомы палітык, лідэр працэсу Рысарджымента (нацыянальнага аб'яднання), п'емонцкі міністр Кавур гаварыў: «Італію мы зляпілі, цяпер давайце злепім італьянцаў». Яго жаданне яшчэ поўнасцю не збылося. Палітыкі таго часу добра разумел!, якія складанасці ім неабходна пераадолець. У час уніфікацыі краіны ўлічваўся тэрытарыяльны прынцып дзяржаўнага будаўніцтва. Ён

абазначае, па-першае, пэўную сацыяльную аднароднасць насельніцтва, нават калі тэрытарыяльна абрысаваныя структуры не могуць быць аднароднымі; па-другое, агульная самасвядомасць калектыву людзей, абмежаванага агульнымі граніцамі. Ад гэтага залежыць моц і працвітанне дзяржавы.

Італьянская культурная сітуацыя адрозніваецца ад іншых. Тут існуе вялікая колькасць правінцый, якія вылучаюцца характарам людзей, традыцыямі, звычаямі, разнастайнасцю мясцовых свят і укладам жыцця. Менавіта таму не трэба ўспрымаць італьянцаў як адзіную нацыю з агульнай на ўсіх культурай і звычаямі. Вядома, яна агульная, апе, складаючыся з асобна ўзятых элементаў, правінцый, становіцца як бы неаднароднай, *культурай у культуры.* Да таго ж самі італьянцы называюць сябе такімі толькі для абазначэння грамадзянства і нацыянальнай салідарнасці і толькі ў прысутнасці іншаземцаў.

Вялікае значэнне надаецца ў Італіі гарадам. Адразу некалькі гарадоў з багатымі гістарыч-нымі традыцыямі могуць іграць ролю культурнага цэнтра. Рым багаты культурнымі і духоўнымі (папскі прастол) традыцыямі. Мілан – другая сталіца сённяшняй Італіі, дзе сучаснасць сустракаецца з мінулым. Фларэнцыя – калыска італьянскай літаратуры, бессмяротнай трыяды знакамітых фларэнційцаў: Дантэ, Петрарака, Бакача. Венецыя – сярэдневяковая марская дзяржава, якая ўстанавіла адносіны Захаду з Усходам. Турын – першая сталіца дзяржавы, цяпер знакамітая выдавецтвам Эйнаудзі і штогодным Салонам Кнігі. Неапаль характарызуецца гарманічным спалучэнем культур (грэчаская, французская, іспанская) і стыляў (класіцызм, ман'ерызм, барока). Прычыны гэтай сітуацыі неабходна шукаць у гісторыі. Да паловы XIX ст. італьянскі паўвостраў быў раздзелены на фрагменты: гарады-дзяржавы (камуны), сіньёрыі, герцагствы, княствы, марскія і гандлёвыя рэспублікі са сваёй палітыкай, культурай, традыцыямі, звычаямі, святамі. Венецыя, Фларэнцыя, Генуя – гарады-дзяржавы – вынік шматгадовай раздробленасці Італіі пасля распаду Рымскай імперыі.

У Італіі, як ні ў адной іншай еўрапейскай краіне, рэгіяналізм праяўляецца настолькі, што многім здаецца больш правільна і дакладна сказаць: Італія – краіна міланцаў, венецыянцаў і неапалітанцаў і г. д., у адпаведнасці з назвай горада, а потым ужо італьянцаў. Акрамя шашы, чыгункі і каталіцкай царквы такія гарады, як Турын і Бары, Неапаль і Трыест, нічога не звязвае. У краіне мясцовыя традыцыі выдзяляюцца на ўсіх узроўнях: ад рытуалу прыняцця ежы да свят, ад стылю жыцця да грамадскай свядомасці і лінгвістычнага выражэння. Шматлікія еўрапейскія краіны маюць свае тыпічныя абласныя характарыстыкі паміж Поўначчу і Поўднем або паміж адной вобласцю і другой. Аднак у Італіі існуюць адрозненні не толькі паміж італьянцамі поўначы і поўдня, але нават паміж жыхарамі адной вобласці. У Таскане, напрыклад, назіраюцца значныя адрозненні паміж такімі гарадамі, як Фларэнцыя, Лука, Сіена і Арэца, хоць усе яны размешчаны ў некалькіх кіламетрах адзін ад аднаго. А такія гарады, як Венецыя і Верона, што знаходзяцца ў вобласці Венета, адрозны не толькі ў ландшафце, архітэктуры, але і ў менталітэце сваіх жыхароў. Нягледзячы на блізкае суседства, яны маюць кожны сваю гісторыю, шлях развіцця і станаўлення.

Існуюць адрозненні паміж Поўначчу, Цэнтральным Поўднем, паўднёвай глыбінкай (Базіліката, Апулья, Калабрыя) і астравамі, што тычыцца менталітэту, стылю жыцця, сацыяльных звычак, культурны паводзін і мовы. На жаль, гаворачы аб праблеме раздробленасці краіны, патрэбна згадаць асноўную: глыбокую няроўнасць у эканамічным развіцці. Італьянцы часам спрошчваюць свае ўнутраныя рознагапоссі шляхам прамалінейнага раздзялення Поўначы і Поўдня.

Італьянскі Поўдзень лічыцца бедным і адсталым у параўнанні з Поўначчу, якая з'яўляецца самай багатай і прамысловай часткай краіны. На поўдні з-за адсутнасці заводаў назіраецца беспрацоўе, таму частка насельніцтва вымушана жыць на дзяржаўныя датацыі і пенсіі. Тут можна гаварыць аб эканамічным дысбалансе, аб сацыяльных і культурных недахопах. Паўднёвыя італьянцы нярэдка больш набожныя і прытрымліваюцца традыцыйных поглядаў, чым паўночныя. Высокая нараджальнасць і ранняе ўступленне ў

шлюб хутчэй характэрны для Поўдня, чым для Поўначы. Нават палітычныя напрамкі ў цэлым адрозніваюцца, паколькі на поўначы (з-за наяўнасці прамысловасці) левыя партыі карыстаюцца большай падтрымкай у насельніцтва. Традыцыйна левыя заўсёды былі мацнейшымі ў вобласці Эмілія-Раманія. Да нядаўняга часу ў паўднёвых абласцях быў высокі ўзровень бязграматных, нават сёння можна сустрэць неадукаваных італьянцаў, здольных размаўляць толькі на дыялекце.

Складана зразумець да канца прычыны эканамічнай адсталасці Поўдня. Але сярод іх неабходна назваць: жорсткі характар клімату, бедныя неўраджайныя глебы, геаграфічная ізаляцыя, шматвяковае адсталае кіраванне. Некаторыя лічаць, што чалавечая цывілізацыя, народжаная ў паўднёвых і ўмераных абласцях (раўніна Ніла, Месапатамія), паступова перамясцілася на поўнач планеты (Еўропа, Паўночная Амерыка).

Паўднёвая Ітлія была багатай і заможнай зямлёй у эпоху грэчаскіх пасяленняў і сярэдневякоўя. Затым рухалася да упадку, перажываючы небяспеку аказацца паміж хрысціянскай Еўропай і Ісламам. Шмат разоў поўдзень быў захоплены і каланізаваны тэрыторыяй, а са стратай важных марскіх шляхоў аказаўся ізаляваным, знаходзячыся на ўскраіне і не маючы магчымасці для абмену і кантактаў з Еўропай.

Застаўшыся ў цяжкім і адсталым становішчы ў адносінах да еўрапейскіх абласцей, якія змаглі перайсці на новы этап індустрыяльнага развіцця, паўднёвым тэрыторыям не ўдалося прыняць удзел у прамысловай рэвалюцыі.

Некалькі дзесяцігоддзяў назад Італія ўяўляла бедную, адсталую краіну, а да канца 50-х – сельскагаспадарчую, паколькі 40 % рабочай сілы было занята ў сельскай мясцовасці. Асабліва гэта адносіцца да тэрыторый, якія размешчаны непадалёку ад прамысловых гарадоў. За апошнія дзесяцігоддзі дабрабыт народа значна палепшыўся, сітуацыя змянілася і ў паўднёвых частках краіны. Італьянцы зрабілі магчымым пераход ад агракультурнай цывілізацыі да індустрыяльнай.

Культура паўднёвай Італіі адрозніваецца ад вясковай культуры на яе Поўначы, але яны абедзве як бы раствараюцца ў агульнай італьянскай. Рэгіяналізм культур – гэта не стадыя іх распаду. У Італіі фрагменты рэгіянальнай культуры ўжо ўтварылі цэлую прастору. Калі некалькі год таму праблема Поўначы і Поўдня мела сур'ёзныя вынікі для грамадства, то сёння сітуацыя змянілася: моладзь паўднёвай часткі Італіі больш адкрыта для сучаснага жыцця, яна «против вчерашнего мира», гатова засвоіць новыя правілы, сістэмы, ідэі. Кіно, ра-дыё, тэлебачанне, друк, машыны, дарогі адкрываюць кожнаму чалавеку панараму вопыту, падштурхоўваюць і вымушаюць пакінуць свой уласны маленькі свет, каб зразумець, што ён не адзіны і не лепшы.

Адрознай рысай рэгіяналізму на лінгвістычным узроўні з'яўляецца аспект драблення ў выкарыстанні дыялектаў, мясцовых гаворак, якія адрозніваюцца ад італьянскага і па сён-няшні дзень выкарыстоўваюцца насельніцтвам усяго паўвострава. У асноўным усе італьянцы білінгвы, паколькі размаўляюць як на дзяржаўнай мове, так і на дыялекце той мясцовасці, дзе жывуць і нарадзіліся. Кожнае мястэчка або веска карыстаецца ўласным дыялектам, аднак можна правесці адзін, больш агульны падзел. Гэта адбываецца паміж моўнымі дыялектамі паўночнай Італіі (гала-італійскія) і дыялектамі, на якіх размаўляюць у астатняй частцы краіны. Мяжа паміж дзвюмя групамі дыялектаў праходзіць паўз часткі Апенін, якая знаходзіцца ў абласцях Тасканы і Эмілі-Раманы (ад горада Специя на Тырэнскім моры да горада Рыміні на Адрыятыцы).

Да канца Другой сусветнай вайны італьянская мова была распаўсюджана ўжо па ўсёй тэрыторыі. Яна заставалася мовай пісьменнасці, адміністрацыйна-бюракратычных устаноў, навуковых колаў і кіруючага класа. Садзейнічала яе распаўсюджанню тэлебачанне. Дома, у вёсках і гарадах, італьянцы размаўляюць на мясцовых дыялектах, або гаворках, якія часта цяжка зразумець нават выхадцам з суседніх абласцей. 60 % італьянцаў размаўляюць на дыялекце, а 14 % – ні на чым, як на дыялекце. Даследаванне, праведзенае Еўрапарламентам, выявіла, што з 28 моў нацыянальных мен-шасцей у Еўрапейскім саюзе 13 прыходзіцца на Італію [8, с. 70]. Так, аўтаномную вобласць Вале

д'Аоста насяляюць франкамоўныя італьянцы, у Альта-Адыджэ размаўляюць па-нямецку; у Трыесце – па-славенску, па-сербску і па-харвацку, па-албанску і па-грэчаску; а на Сардыніі – на старажытнай раманскай мове – сардынскай і па-каталанску.

Нягледзячы на тое што італьянцы разумеюць па-італьянску і амаль уся моладзь карыстаецца ей, трэба адзначыць, што размаўляюць італьянцы на дыялекце па сваім выбары, а не па неабходнасці.

Аналізуючы рэгіяналізм, можна зрабіць вывад, што гэта асаблівасць захавалася з моманту аб'яднання Італіі і па сённяшні дзень дзякуючы наступнаму фактару. У адзінай і аб'яднанай Італіі не хапала дамінуючага цэнтра, які б навязваў гегемонію, гэта значыць поўнае панаванне ў палітычнай, адміністрацыйнай, эканамічнай і культурнай галінах.

Такім чынам, італьянская культурная прастора не з'яўляецца гамагеннай прасторай нацыя-нальнай культуры. Яна не мае акрэсленых граніц, што параджае праблему ідэнтычнасці. Пры характарыстыцы італьянскай ідэнтычнасці не заўсёды працуе крытэрый моўнай прыналежнасці або ідэя культурнай традыцыі. Неаднаразова перарываемая і выцясняемая іншымі культурамі, яна не нясе ў сабе ўнутранага адзінства. Культурная прастора Італіі не мае цэласнай будовы ў тым выглядзе, у якім яна характэрна для культуры любога народа, які не мае «провалов» у дзяржаўнай незалежнасці, моўнай і культурнай самастойнасці, праблем з унутранай і знешняй ідэнтыфікацыяй. Культурная праблема Італіі – гэта адсутнасць моцнай, гамагеннай, нацыянальнай культурнай прасторы, адсутнасць гістарычна склаўшыхся крыніц культурнай ідэнтыфікацыі.

Відавочна, што тэрытарыяльна акрэсленыя структуры не могуць быць абсалютна аднароднымі. Адзначым, што тэрытарыяльныя адзінкі Італіі, несупадаючы з лінгвістычнымі, тоесны з рэлігійнымі. Таму яны як бы паглынаюцца больш значным фактарам – прыналежнасцю да адной з сусветных рэлігій. Нацыянальнасць і лаяльнасць дзяржаўным інстытутам можа значыць менш, чым веравызнанне, гэта значыць асноўную ролю іграе пачуццё салідарнасці або яднання з канфесіяй, чыя зона ўплыву пераўзыходзіць нацыянальныя межы.

Варта адзначыць, што адрознай рысай нацыянальнай культуры з'яўляецца мазаіка субкультур, у якіх яна развіваецца. На сацыякультурным узроўні італьянская культура не ўяўляе адзінага нацыянальнага феномена, а падтрымліваецца і развіваецца ў розных сацыякультурных кантэкстах. Яна адлюстроўвае асадак мінулага, якому ўдаецца пастаянна абнаўляцца. Нельга сказаць, што ў абласцях перавышаюць этнанацыянальныя ідэалагічныя матывы. «Менталитет этнонационалиста включает установку на исторический реванш, даже если речь идет о реалиях, удаленных не на одну сотню лет. Он видит мир сквозь призму интересов общего – своего этноса, выталкивая из поля зрения едва ли не все, што связано с единичным – естественными правами личности» [1, с. 29].

Такім чынам, у краіне назіраецца дастатковае структурыраванне інстытутаў грамадзянскага грамадства, што гаворыць аб адкрытасці і схільнасці да рэфарматарства рэгіянальнай палітычнай эліты. Важнай функцыяй рэгіянальнай ідэалогіі з'яўляецца кансалідацыя сацыяльнага соцыуму на аснове прынцыпаў рэгіянальнай салідарнасці. Этнічна разнароднае грамадства стварае ўмовы для развіцця унутранай асіметрыі, што носіць структурны характер, адлюстроўваючы дыферэнцыяцыю паміж абласцямі.

Як адзначалася, у італьянскім соцыуме добра развіта мадэль полікультуралізму і пашырана прастора розных культурных практык, даючы магчымасць індывіду права выбару ўласнай ідэнтычнасці. Таму сацыякультурная шматварыянтнасць прасторы краіны іграе пазітыўную ролю. Этнакультурная разнастайнасць не стварае сур'ёзных палітычных праблем для краіны, паколькі забяспечвае сацыяльны парадак і дробную, фрагментарную палітычную прастору. Нормы, якія рэгулююць і забяспечваюць рэгіянальную ідэнтычнасць, па сваім ўплыве супаставімы, а калі-нікалі мацнейшыя за агульнанацыянальныя нормы. Гэтым і тлумачыцца ўстойлівы, стабільны характар развіцця «областничества».

Сучаснае грамадства патрабуе адкрытасці, крэатыўнасці, плюралізму. Плюралістычнасць магчыма і ўнутры нацыі. Яна патрабуе пераадолення традыцыйных стэрэа-тыпаў і новых крэатыўных рашэнняў. Нацыянальная ідэнтычнасць дасягаецца не нацыя нальнай гамагенезацыяй насельніцтва, а падтрымкай разнастайных індывідуальных ідэнтычнасцей.

Крышталізацыя італьянскага «Я», захаванне самабытнасці, арыгінальнасці і непаўторнасці культурна-цывілізацыйнага феномена, выбудоўванне адносін з іншымі культурамі на аснове дыялога, полікультурнасці – сёння галоўная і неабходная задача для італьянскай культуры.

*Літаратура:*


1. Бажанов В. А. О феномене этнонационализма. Может ли Татария быть катализатором общероссийских тенденций? // Наука, культура, высшее образование на пороге XXI века. Ульяновск, 1998. Вып. 4. С. 29.
2. Диалог культур и культурная политика государства в полиэтническом регионе: Материалы постоянно действующего регионального науч. семинара «Полиэтнический регион: диалог культур и перспективы развития» / Отв. ред. Г. Е. Шкалина и др. Йошкар-Ола, 1997.
3. Зидентоп Л. Демократия в Европе: Пер. с англ. / Под ред. В. Л. Иноземцева. М., 2001.
4. ФН Философские науки 4/2004 Москва Гуманитарий. Министерство образования российской федерации. Академия Гуманитарных исследований.
5. Andrew Hurrel. Expanding in Resurgence of Regionalism in World Politics // Review of International Studies. Vol. 21. № 4. October. 1995.
6. Daniel Lerner. Some Comments on Center - Periphery Relations // Comparing Nations. The use of Quantative Data in Cross-National Research. Edited by Richard L. Merrit and Stein Rokkan. New Haven and London, Yale University Press. 1996.
7. Robrt Dahl, Edward Tufte. Size and Democracy. Stanford University press. Stanford, California, 1973, p. 72–93.
8. Solly Martin, Xenophobe's Guide to the Italians, Oval Books, 1995, 70 p.